УДК 371.1(091)

В. М. Астрога, асістэнт

# ПАДРЫХТОЎКА НАСТАЎНІЦКІХ КАДРАЎ ДЛЯ ГАРАДСКІХ ВУЧЫЛІШЧАЎ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

The article examines professional traininq of teachers for urban educational institutions in Belarus alt the beqinninq of the XX century. The problems, related to the orqanization and activities of teachers' institutes are considered. The article considers the causes of creating teacher-training institutes on the territory of Vilensk educational region, the rules of admission, the teaching staff, the contents of instructions regulating activities of these educational institutions. It analyzes educational plans and syllabi, the status of teacher-training institutes/ It presents information on opening some teacher-training institutes (in Vitebsk in 1910, in Mogilev in 1913 and in Minsk in 1914) and attempts to eliminate shortcomings after the February revolution in 1917.

**Уводзіны.** Новыя грамадска-эканамічныя адносіны ў другой палове XIX ст. стварылі патрэбу ў больш шырокім развіцці прафесійнай адукацыі і пісьменнасці насельніцтва. «Усе нацыі пазнаюць цяпер ісціну, што іх будучы лёс, іх прамысловы і гандлёвы дабрабыт залежыць перш за ўсё ад таго, наколькі шырока і свабодна пастаўлена справа народнай адукацыі» [1], – падкрэслівала ў дакладзе англійская камісія па даследванні асветы ў Германіі. Развіццё капіталізму ў Расіі суправаджалася ростам прамысловасці, знешняга і ўнутранага рынкаў, колькасным ростам гарадскога насельніцтва. Узніклі новыя задачы і патрабаванні ў галіне народнай адукацыі, якія былі звязаны з павышэннем адукацыйнага ўзроўню насельніцтва і пашырэннем прафесійных навыкаў.

**Асноўная частка.** У 1872 г. Аляксандр II выдаў указ аб правядзенні рэарганізацыі павятовых вучылішчаў у гарадскія вучылішчы, прызначэнне якіх заключалася ў тым, каб даць павышаную пачатковую адукацыю дзецям дробных служачых, гандляроў, рамеснікаў і другіх слаёў гарадскога насельніцтва. Гэтыя вучылішчы, якія адкрываліся ў гарадах і буйных мястэчках, былі пачатковымі школамі з 6-гадовым тэрмінам навучання. Яны давалі больш пашыраную і грунтоўную адукацыю, чым папярэднія павятовыя вучылішчы. Аднак стварэнне новай сеткі выклікала пэўныя цяжкасці: педагагічных навучальных устаноў па падрыхтоўцы выкладчыкаў для гарадскіх вучылішчаў і сярэдніх школ у Беларусі не было. Настаўнікі для іх прысылаліся з Вільні, Масквы, Пецярбурга [2].

З мэтай хутчэйшага вырашэння кадравага пытання міністэрства пачало адкрываць настаўніцкія інстытуты. У 1872 г. быў зацверджаны статут і пачалі працаваць два настаўніцкія інстытуты ў С.-Пецярбургу і Маскве. У 1873 г. для падрыхтоўкі выкладчыкаў пачатковых яўрэйскіх вучылішчаў ствараецца Віленскі яўрэйскі настаўніцкі інстытут. У 1874г. міністэрства народнай асветы прыйшло да высновы аб неабходнасці адкрыцця другога (рускага) настаўніцкага інстытута ў г. Вільня. Неабходнасць такога рашэння дыктавалася не толькі неабходнасцю ў падрыхтоўцы настаўнікаў для гарадскіх вучылішчаў, але і дыктавалася пэўнымі палітычнымі матывамі [3].

Віленскі (рускі) настаўніцкі інстытут быў адкрыты ў складзе трох класаў. Тэрмін навучання працягваўся тры гады. Тыповыя штаты гэтай навучальнай установы ўключалі пасады дырэктара, законанастаўніка, 4-х выкладчыкаў навук, 2-х выкладчыкаў чыстапісання, чарчэння і малявання, 2-х настаўнікаў спеваў і гімнастыкі, урача, эканома і пісара, а таксама 2-х настаўнікаў гарадскога пры інстытуце вучылішча, дзе выхаванцы праходзілі педагагічную практыку. З дзяржаўнай казны на ўтрыманне інстытута штогод адпускалася 28 900 руб., з якіх пэўная колькасць грошай ішла на стыпендыі, вучэбныя і гаспадарчыя расходы.

Віленскі (яўрэйскі) настаўніцкі інстытут меў некаторыя асаблівасці: працягласць навучання была чатырохгадовай, акрамя таго, уводзілася пасада інспектара – непасрэднага памочніка дырэктара па вучэбна-выхаваўчай і адміністрацыйнай частцы. Павелічэнне тэрміна навучання выхаванцаў тлумачылася ўвядзеннем ў дадатак да звычайнага плана настаўніцкіх інстытутаў такіх прадметаў, як яўрэйская мова, яўрэйскі закон веры, біблейская гісторыя, гісторыя яўрэяў пасля біблейскага перыяду і іншыя прадметы рэлігійнага курса. Пры інстытуце працавала пачатковае яўрэйскае вучылішча [4].

Згодна з зацверджаным у 1874 г. «Правілам аб дадатковых пры настаўніцкіх інстытутах курсах для настаўнікаў павятовых вучылішчаў», пры інстытутах ствараліся дадатковыя педагагічныя курсы для настаўнікаў павятовых вучылішчаў тэрмінам не больш як на адзін год з мэтай павышэння агульнатэарэтычнай і метадычнай падрыхтоўкі для працы ў гарадскіх вучылішчах [5].

У сваёй дзейнасці настаўніцкія інстытуты падпарадкоўваліся кіраўніцтву Віленскай навучальнай акругі. Шэраг выданых Міністэрствам народнай асветы інструкцый рэгламентаваў працу гэтых устаноў, у тым ліку арганізацыю

вучэбна-выхаваўчай і педагагічнай падрыхтоўкі. Вызначаліся правы і абавязкі дырэктара інстытута, выкладчыкаў, дзяжурных настаўнікаў, педагагічнага савета і абслугоўваючага персаналу.

Згодна з «Палажэннем 31 сакавіка 1872 года», настаўніцкія інстытуты з'яўляліся навучальнымі установамі закрытага тыпу (пры іх ствараліся інтэрнаты, якія працавалі да 1907 г.) і ўтрымліваліся за кошт казны. Планавалася набіраць 75 выхаванцаў, з якіх 60 былі казённымі стыпендыятамі. На вучобу прымаліся асобы з 16 гадоў без фізічных недахопаў, якія б маглі памяшаць выкананню абавязкаў настаўніка, з прадстаўленнем спраўкі ад мясцовага святара аб добрых паводзінах. Умовы прадугледжвалі ўступныя экзамены па закону божаму, рускай мове, арыфметыцы, геаметрыі, гісторыі і геаграфіі ў аб'ёме праграм павятовых (гарадскіх) вучылішчаў.

Зацверджаны Міністэрствам асветы вучэбны план інстытутаў уключаў закон божы, педагогіку з дыдактыкай, рускую мову і царкоўнаславянскае чытанне, арыфметыку і пачатак алгебры, геаметрыю, усеагульную гісторыю і гісторыю Расіі, усеагульную геаграфію і геаграфію Расіі, прыродазнаўства і фізіку, чарчэнне, маляванне, чыстапісанне, спевы і гімнастыку. Курс педагогікі, напрыклад, складаўся з такіх раздзелаў, як фізічнае, разумовае і маральнае выхаванне, дыдактыка і агульная методыка, гісторыя педагогікі, школазнаўства. Гэта агульнаадукацыйная падрыхтоўка ў асноўным была некалькі ніжэйшай у параўнанні з гімназіяй ці рэальным вучылішчам. Разам з тым, аб'ём ведаў, якія даваў інстытут, напрыклад, па мове, гісторыі і геаграфіі, былі шырэйшымі і глыбейшымі, чым давалі адзначаныя сярэднія навучальныя ўстановы.

Па свайму статуту настаўніцкія інстытуты павінны былі даваць незаконачаную вышэйшую адукацыю, але ў матэрыяльным становішчы, вучэбным і навуковым забеспячэнні, у правах сваіх выпускнікоў яны саступалі нават сярэднім навучальным установам. Так, выпускнікі інстытутаў, у адрозненне ад закончыўшых гімназіі і рэальныя вучылішчы, не мелі права паступаць у вышэйшыя навучальныя ўстановы. Асаблівая ўвага надавалася педагагічнай і метадычнай падрыхтоўцы будучага настаўніка, а агульнаадукацыйная абмяжоўвалася тымі прадметамі, якія будучаму настаўніку даводзілася весці ў гарадскім вучылішчы. Не ставілася задача даць выхаванцам шырокія навуковыя веды, аднак пэўны аб'ём ведаў павінен быў быць засвоены грунтоўна. Настаўніцкі інстытут рыхтаваў настаўніка шырокага профілю з тым, каб ён мог весці ўрокі па ўсіх ці некалькіх прадметах гарадскога вучылішча. Такім чынам, спецыялізацыя падрыхтоўкі настаўнікаў у інстытуце па сутнасці адсутнічала.

Дырэктар інстытута павінен быў мець універсітэцкую адукацыю і вялікі вопыт педагагічнай работы. Ён прызначаўся апекуном вучэбнай акругі і з'яўляўся непасрэдным кіраўніком інстытута: адказваў за арганізацыю і змест навучальнага працэсу, вёў паседжанні педагагічнай рады, загадваў гаспадаркай і фінансамі. Дырэктар штодзённа наведваў класныя заняткі і правяраў веды выхаванцаў, кантралюючы такім чынам якасць працы кожнага выкладчыка. Праз кожныя два месяцы паспяховасць выхаванцаў па кожнаму прадмету разглядалася на паседжанні педагагічнай рады.

Да пачатку XX ст. змест навучання і вучэбныя праграмы настаўніцкіх інстытутаў састарэлі, у той час як патрабаванні да іх узраслі. Па-ранейшаму дазвалялася паступаць сюды асобам з рознай адукацыйнай падрыхтоўкай, з-за чаго зніжаўся агульны ўзровень выкладання. У сувязі з гэтым у пачатку 1907 г. на спецыяльна скліканай Міністэрствам адукацыі нарадзе абмяркоўваліся пытанні дзейнасці настаўніцкіх інстытутаў: прызнавалася пажаданым прадоўжыць тэрмін навучання да чатырох гадоў; на вучобу прымаць толькі тых асоб, якія мелі званне настаўніка пачатковага вучылішча і адпрацавалі на гэтай пасадзе не менш за два гады. Прадугледжвалася праводзіць конкурсны экзамен у аб'ёме праграмы гарадскіх вучылішчаў і дадаткова па прыродазнаўству і фізіцы. Выказвалася меркаванне падзяліць у апошнім класе выхаванцаў па спецыяльнасці на дзве групы: літаратурна-гістарычную і прыродазнаўча-матэматычную, у якасці новых прадметаў увесці логіку, псіхалогію, гігіену. Педагагічныя саветы інстытутаў з 1908 г. мелі права пры ўзгадненні з кіраўніцтвам навучальнай акругі карэктыраваць і часткова змяняць вучэбныя праграмы, выбіраць лекцыйную ці ўрочную сістэму выкладання па кожным прадмеце. На нарадзе падкрэслівалася, што існуючыя пры інстытутах інтэрнаты будзе больш мэтазгодна зачыніць, бо «у тым выглядзе, у якім яны існуюць у цяперашні час, не адказваюць свайму прызначэнню» [6]. Але на практыцы гэтыя пажаданні так і не сталі абавязковымі для выканання.

Значнае месца ў вучэбнай рабоце настаўніцкіх інстытутаў адводзілася педагагічнай накіраванасці ўсяго навучальнага працэсу, што знаходзіла сваё яркае адлюстраванне ў добра арганізаванай педагагічнай практыцы. У самым пачатку яе праходжання выхаванцы наведвалі ўрокі настаўнікаў гарадскіх вучылішчаў, назіраючы за педагагічным працэсам, знаёмячыся з жыццём, распарадкам і выкладаннем розных прадметаў. Існавала практыка правядзення выкладчыкамі настаўніцкага інстытута і штатнымі

настаўнікамі вучылішча ўзорных урокаў. Такая пасіўная практыка-назіранне працягвалася два тыдні, пісьмовыя і вусныя справаздачы аб якой абмяркоўваліся на педагагічных нарадах. Наступным крокам было выкладанне выхаванцамі інстытута ў гарадскім вучылішчы згодна з існуючымі праграмамі. Падрыхтоўка да ўрока заўсёды праводзілася пад кіраўніцтвам выкладчыка інстытута, які і вызначаў ступень падрыхтаванасці да практыкі і сачыў за яе ходам. На такім занятку ў абавязковым парадку прысутнічалі ўсе выхаванцы, якія фіксавалі ўвагу на станоўчых момантах і недахопах урока свайго калегі, робячы запісы ў сшытках. Вынікі практыкі абмяркоўваліся на агульных педагагічных пасяджэннях у прысутнасці выхаванцаў трэцяга класа і членаў педагагічнага савета.

Вялікая ўвага ў настаўніцкіх інстытутах удзялялася выхаваўчай рабоце, у тым ліку непасрэднаму нагляду за паводзінамі навучэнцаў як пад час навучання, так і ў пазакласны час, што ўваходзіла ў непасрэдныя функцыянальныя абавязкі дырэктара, выкладчыкаў і дзяжурных выхавацеляў. Значная работа праводзілася па развіццю эстэтычных густаў і схільнасцяў. Іх вучылі спяваць, маляваць і іграць на розных музычных інструментах (скрыпцы, фартэпіяна і інш.), выхоўвалі такія рысы, як ахайнасць, падтрыманне парадку і чысціні ў асабістых рэчах, у інтэрнаце і класе, навыкі беражлівых адносін да казённай маёмасці, асабістых сродкаў і рэчаў. Рэлігійнае выхаванне заключалася галоўным чынам у працэсе вывучэння закона божага, захоўванні рэлігійных абрадаў і ўдзеле ў царкоўных богаслужэннях. Дырэктар наведваў выхаванцаў, калі яны маліліся, снедалі, абедалі, правяраў кандуітныя кнігі, якія вялі класныя настаўнікі. У гэтых кнігах запісваліся назіранні за вучобай і паводзінамі навучэнцаў. Яны былі своеасаблівым дакументам, на аснове якога складаліся характарыстыкі кожнага юнака як пры пераводзе ў наступны клас, так і пры выпуску з інстытута. У арсенале выхаваўчых метадаў кандуіт быў магутным сродкам падаўлення асобы будучага настаўніка і фарміравання бездакорнай пакорнасці начальству, выканання ўстаноўленых правілаў інстытута [7].

На працягу трыццаці пяці гадоў у Віленскай навучальнай акрузе існавалі толькі два настаўніцкія інстытуты, з якіх Віленскі яўрэйскі інстытут рыхтаваў настаўнікаў выключна для яўрэйскіх вучылішчаў. Такім чынам, толькі Віленскі рускі настаўніцкі інстытут рыхтаваў выкладчыкаў гарадскіх і вышэйшых пачатковых вучылішчаў (з 1912 г.). Выпускаючы ў сярэднім 20 настаўнікаў ў год, ён не мог задаволіць патрэбу ў педагагічных кадрах для цэлага краю. Значна пачынае расці сетка павышаных школ – гарадскіх і вышэйшых пачатковых вучылішчаў, прычым яны ствараюцца не толькі ў адміністрацыйных і прамысловых цэнтрах, але і ў сельскай мясцовасці. Толькі з 1907 па 1912 г. у Мінскай губерні колькасць гарадскіх вучылішчаў павялічылася з 17 да 28, таму адчуваўся значны недахоп настаўнікаў з інстытуцкай адукацыяй [8]. Аднак адкрыццё іншых настаўніцкіх інстытутаў зацягвалася. Для гэтага меліся розныя прычыны: ад фінансавых (недахоп грошай) да палітычных (працяг царскім урадам лініі штучнага стрымлівання росту культурна-асветных устаноў на Беларусі). У сувязі з гэтым міністэрства народнай адукацыі мэтазгодна затармажвала адкрыццё дяржаўных пачатковых навуальных устаноў, якія, ў сваю чаргу, патрабавалі «дарагую» падрыхтоўку кваліфікаванага выкладчыка, і адкрывала царкоўна-прыходскія школы і школы граматы.

Новы настаўніцкі інстытут быў створаны ў 1910 г. у Віцебску. У самым пачатку ён не меў адпаведнага вучэбнага памяшкання і размяшчаўся ў будынку былой ваеннай казармы. Урачыстае адкрыццё новай навучальнай установы адбылося 21 лістапада, але заняткі вяліся ўжо з 15 кастрычніка. На гэтым мерапрыемстве прысутнічалі высокія госці, у тым ліку апякун Віленскай навучальнай акругі прафесар Г. В. Лявіцкі, Віцебскі губернатар барон Б. Б. Гершау-Флотаў, шырокія колы грамадскасці. Дырэктарам інстытута быў назначаны К. І. Ціхаміраў. У першы ж год адкрыцця магчымасць вучыцца атрымалі 35 чалавек [9].

Пазней такія ж навучальныя ўстановы былі адкрыты ў Магілёве (1913 г.) і другім буйным пасля Вільні горадзе Беларусі – Мінску (1914г.). Пры іх стварэнні матэрыяльную дапамогу аказалі органы гарадскога самакіравання і земскія ўстановы. Кантынгент выхаванцаў гэтага перыяду з года ў год папаўняўся выхаванцамі настаўніцкіх семінарый, адпрацаваўшых ў пачатковых школах не менш як два гады, а таксама выпускнікамі сярэдніх навучальных устаноў. Дырэктарам Мінскага настаўніцкага інстытута быў назначаны Дз. А. Сцяпура, які да гэтага ўзначальваў Рагачоўскую настаўніцкую семінарыю [10]. Выкладчыцкі калектыў складаўся з 7 чалавек: М. Гамолка, У. М. Ігнатоўскі, А. М. Нікольскі і інш.

Да лета 1915 г. у выніку наступлення кайзераўскай арміі Мінск стаў прыфрантавым горадам. У жніўні ў інстытуце яшчэ паспелі правесці ўступныя экзамены, збіраліся адкрыць пры ім узорнае гарадское вучылішча, але ўжо 1 верасня выйшаў загад аб тэрміновай эвакуацыі ў цэнтральныя расійскія губерні. Месцам знаходжання пад час бежанства стаў г. Яраслаў.

Яркім дакументам аб бядотных умовах жыцця выхаванцаў Мінскага настаўніцкага інстытута ў 1914 – 1915 г. з'яўляецца дакладная запіска кіраўніка І класа У. Ігнатоўскага, у якой

адзначаецца, што «выхаванцы жывуць на кватэрах, звычайна па 2 чалавекі ў пакойчыку. Яго кошт – ад 6 да 10 рублёў у месяц (стыпендыі звычайна 12 руб. 50 кап. у месяц). Жыллё звычайна выглядае вельмі сціпла. З кніг ёсць толькі падручнікі. Большасць выхаванцаў харчуюцца ў кватэрнай гаспадыні; кошт абеда – 30 кап. Тэатр не наведваюць (адны тлумачаць гэта недахопам грошай, іншыя – часу). Часта сумесна рыхтуюцца да заняткаў ці да экзаменаў, збіраючыся ў каго-небудзь на кватэры. Калі-небудзь сумесна з крамы бяруць на вызначаны час неабходную кніжку, якую яны чытаюць усе разам» [11]. Педагагічная рада інстытута безвынікова прасіла апекуна акругі павялічыць студэнтскую стыпендыю з 150 да 200 руб.

Недахопы ў педагагічнай адукацыі Міністэрства народнай асветы імкнулася ліквідаваць пасля Лютаўскай рэвалюцыі. 14 чэрвеня 1917 г. за подпісам старшыні Савета Міністраў Львова і міністра народнай адукацыі праф. Мануйлава было выдадзена новае палажэнне аб настаўніцкіх семінарыях і інстытутах. Настаўніцкія інстытуты па-ранейшаму заставаліся ў складзе 3-х класаў з трохгадовым курсам навучання, але прадугледжвалася значнае павышэнне агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі абітурыентаў. На першы курс маглі пАступаць толькі асобы, якія мелі закончаную агульную сярэднюю адукацыю, а таксама выхаванцы настаўніцкіх семінарый Віленскай навучальнай акругі, якія адпрацавалі ў пачатковых школах не менш за два гады. Планавалася пашырэнне вучэбных планаў і праграм, каб рыхтаваць настаўніка-прадметніка, а не выкладчыка шырокага профілю, як было да гэтага. Уводзілася вывучэнне палітэканоміі, філасофіі, іншых дысцыплін. Інстытуты пераўтвараліся ў навучальныя ўстановы змешанага тыпу (да 1917 г. прымалі выключна асоб мужчынскага полу); іх выхаванцы атрымалі званне студэнтаў і мелі права паступаць ва універсітэты і іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы. Так, у Мінскім настаўніцкім інстытуце з 1917 г. пачаў выкладацца курс гісторыі Беларусі, распрацаваны У. Ігнатоўскім [12]. Ужо працавалі славесна-гістарычнае, фізіка-матэматычнае і геаграфа-прыроднае аддзяленні. У 1918 – 1919 гг. настаўніцкія інстытуты былі рэфармаваны ў педагагічныя інстытуты.

**Заключэнне.** Такім чынам, калі ўлічыць адсутнасць на тэрыторыі Беларусі вышэйшых навучальных устаноў, можна сцвярджаць, што настаўніцкія інстытуты рыхтавалі лепшых для свайго часу спецыялістаў. Нягледзячы на шэраг істотных недахопаў, яны мелі нядрэнную матэрыяльна-тэхнічную базу для навучання, дастаткова вопытных выкладчыкаў, распрацаваныя планы і праграмы, што ў асноўным забяспечвала магчымасць атрымання будучымі педагогамі адпаведнай тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі. За гэтыя складаныя дзесяцігоддзі быў набыты каштоўны практычны вопыт, створаны багаты арсенал формаў і метадаў прафесійнай адукацыі.

### Літаратура


1.Самойлович, И. А. Экономическое значение народного образования; положение последнего и его нужды в Витебской губернии. – Витебск, 1903. – С. 1.

2. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: Са старажытных часоў да 1917 г. / М. А. Ткачоў і інш.; рэд. М. А. Лазарука. – Мінск., 1985. – С. 384.

3. Кравцов, А. И. Педагогическое образование в Белоруссии в дооктябрьский период // Учёные записки Минского гос. пед. ин-та ин. языков. Сер. педагогическая. – Минск, 1958. – Вып. 1. – С. 38 – 39.

4. Там жа.

5. Настольная книга по народному образованию: 3 т. / Сост. Г. Фальборк, В. Чарнолуский. – СПб, 1901. – Т. 2. – С. 1088.

6. Местная хроника. Реформа учительских институтов // Народное образование в Виленском учебном округе. – 1907. – С. 120-122.

7. Кравцов, А. И. Ук. соч. – С. 44-45.

8. Ляхоўскі, У. В. Прадвеснік Адраджэння // Адукацыя і выхаванне. – 1994. – № 11. – С. 103.

9. Открытие Витебского учительского института // Народное образование в Виленском учебном округе. – 1911. – № 1. – С. 32 – 33.

10. НГАБ. Фонд 478, воп. 1, спр. 19, л. 14.

11. Ляхоўскі, У.В. Назв. праца. – С. 105–106.

12. НГАБ. Фонд 478, воп. 1, спр. 4, л. 35–36.